ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1985
17
СТУДЗЕНЯ
ЧАЦВЕР
№ 2 (1452)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

«Беларускі універсітэт» ТЭЛЕТАЙП «Учора • Сёння • Заўтра»

Дзякуюць шэфам

члены атрада чырвоных следапытаў «Арляня» імя Героя Савецкага Саюза К. Ф. Альшанскага. Нядаўна ў сваім пасёлку Ждановічы, што на Міншчыне, яны атрымалі ключы ад піянерскага пакоя ў новым доме.

І на дапамогу падшэфным прыехалі студэнты факультэта журналістыкі. Першакурснікі папрацавалі на славу. Ужо к вечару наступнага дня ў пакоі стаяла мэбля, усё было прывезена да ладу. Рабяты аднадушна дзякавалі сваім старэйшым таварышам.

І. ШУМЕЙКА,
студэнтка факультэта журналістыкі.

40-годдзю Перамогі

савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне прысвячалася студэнцкая навуковая канферэнцыя, што прайшла на гістарычным факультэце. Адкрыў яе дацэнт кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў І. Ф. Раманоўскі.

На канферэнцыі былі заслуханы даклады студэнтаў другога курса А. Хвяжэнкі, А. Налівайка, Н. Чэрнікавай, І. Качалава, І. Еўтухова, у якіх яны аналізавалі ролю КПСС як натхняльніка і арганізатара перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай, дзейнасць камсамола ў гады вайны, гістарычнае значэнне перамогі СССР.

Т. ПУЗАВА,
студэнтка гістарычнага факультэта.

Таварыства кнігалюбаў

паведамляе, што ў кніжны кіёск універсітэта паступілі новыя кнігі: Гурко Е. Н. «Эмпирическое и теоретическое в социологическом исследовании», Кузнецова Л. Ф. «Картина мира и её функции в научном познании», Кошелев В. С. «Египет: уроки истории», Титов О. И. «Объективная и субъективная вероятность», «Современный русский язык. Под ред. Д. Э. Розенталя», Хорнби А. С. «Учебный словарь современного английского языка».

АДНАДУШНАЯ ПАДТРЫМКА

У БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА ПРАЙШОЎ СХОД ПА ВЫЛУЧЭННЮ КАНДЫДАТА Ў ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР ПА АЛІБЕГАЎСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУЗЕ № 26.

СВЯТОЧНАЯ атмасфера ўладарыла ў актавай зале універсітэта. Адкрыў сход старшыня прафсаюзнага камітэта супрацоўнікаў У. Т. Шалатонін. Ён адзначыў, што выбарчая кампанія — пераканаўчае сведчанне дэмакратызму нашага ладу, росту сацыяльнай і палітычнай актыўнасці грамадзян. У выніку выбараў будуць сфарміраваны заканадаўчыя органы рэспублікі. Лепшых прадстаўнікоў рабочага класа, калгаснага сялянства, народнай інтэлігенцыі вылучаюць працоўныя калектывы рэспублікі кандыдатамі ў дэпутаты.

Слова даецца дэкану факультэта радыёфізікі і электронікі А. М. Шырокаву. Выбары ў Вярхоўны Савет БССР з'яўляюцца важнай палітычнай падзеяй у жыцці рэспублікі, сказаў ён. Яны праводзяцца ва ўмовах вялікага палітычнага ўздыму, звязанага з дастойнай сустрэчай чарговага XXVII з'езда КПСС.

У нашай агульнанароднай дзяржаве выбары маюць вялікае значэнне для развіцця сацыялістычнай дэмакратыі. Адначасова гэта і справаздача аб дзейнасці Саветаў папярэдняга і наказ кандыдатам у дэпутаты будучага склікання. Дэпутатамі вышэйшага заканадаўчага органа выбіраюцца людзі, для каго служэнне народу стала сэнсам жыцця. Такім чалавекам з'яўляецца рэктар БДУ імя У. І. Леніна акадэмік АН БССР Л. І. Кісялеўскі.

Мы добра ведаем Л. І. Кісялеўскага як вядомага вучонага фізіка, абагаціўшага навуку новымі важнымі рэзультатамі ў галіне плазмы.

Заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі БССР Л. І. Кісялеўскі з'яўляецца адным з арганізатараў навукі ў рэспубліцы. Доўгі час ён працаваў намеснікам дырэктара Інстытута фізікі АН БССР і з'яўляўся галоўным вучоным сакратаром Прэзідыума АН БССР.

А. М. Шырокаў ад імя калектыву Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна прапанаваў вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР па Алібегаўскай выбарчай акрузе № 26 кандыдата ў члены ЦК КПБ, рэктара універсітэта акадэміка АН БССР Леаніда Іванавіча Кісялеўскага.

Л. І. Кісялеўскі — вядомы вучоны ў галіне фізікі плазмы, стварэння дыягнастычных спектральных прылад і сістэм. Ім распрацаваны арыгінальныя метады і апаратура дыягностыкі плазмы, якая выкарыстоўваецца ва ўстаноўках новай тэхнікі; устаноўлены важныя заканамернасці ўзаемадзеяння плазмы з цвёрдымі матэрыяламі, пакладзеныя ў аснову плазменных тэхналагічных працэсаў.

Леанід Іванавіч Кісялеўскі — аўтар больш чым 160 навуковых работ, у тым ліку 10 вынаходніцтваў. Ён актыўна ўдзельнічае ў педагагічнай рабоце, чытае лекцыі, з'яўляецца навуковым кіраўніком студэнтаў-дыпломнікаў і аспірантаў. Леанід Іванавіч падрыхтаваў 19 кандыдатаў навук. Ён неаднаразова выступаў з навуковымі дакладамі на Усесаюзных і Міжнародных канферэнцыях.

Леанід Іванавіч прымае таксама актыўны ўдзел у навукова-арганізацыйнай рабоце. Ён з'яўляецца членам бюро Навуковага савета АН СССР па комплекснай праблеме «Фізіка плазмы», старшынёй Навуковага савета АН БССР па фізіцы і тэхніцы плазмы, уваходзіць у састаў рэдкалегій навуковых часопісаў «Журнал прикладной спектроскопии» і «Известия АН БССР», з'яўляецца старшынёй савета рэктараў ВНУ горада Мінска. Праводзіць вялікую работу ў якасці кандыдата ў члены ЦК КПБ, члена Мінскага гаркома КПБ.

Радзіма высока ацаніла заслугі Л. І. Кісялеўскага. Ён узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна», Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Затым выступіла студэнтка ФПМ Л. Панчанка. Яна падтрымала прапанову аб вылучэнні кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР па Алібегаўскай выбарчай акрузе № 26 рэктара універсітэта Л. І. Кісялеўскага. Уся працоўная дзейнасць рэктара — прыклад для пераймання. Моладзь вучыцца ў яго патрабавальнасці да сябе і да іншых, сціпласці. Нягледзячы на сваю занятасць, ён заўсёды знаходзіць час для сустрэч са студэнтамі, для размовы з імі.

Мы вылучаем у састаў нашага рэспубліканскага заканадаўчага органа Савецкай улады чалавека, усё жыццё якога з'яўляецца ўзорам служэння справе Камуністычнай партыі, савецкага народа і навукі, сказаў у сваім выступленні рэгуліроўшчык радыёапаратуры СКТБ з ВВ А. С. Дудар. Пачаўшы сваю дзейнасць рабочым, Леанід Іванавіч, дзякуючы правам, дадзеным кожнаму чалавеку Савецкай уладай, стаў у першыя рады буйнейшых вучоных нашай краіны.

А. С. Дудар падтрымаў таксама прапанову аб вылучэнні кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР Леаніда Іванавіча Кісялеўскага.

Ветэран Вялікай Айчыннай вайны К. К. Герман у сваім выступленні сказаў, у прыватнасці: сілы імперыялізму і рэакцыі на чале з ЗША актыўна вядуць падрыхтоўку да новай сусветнай вайны, нарошчваюць стратэгічныя ядзерныя сілы супраць СССР і краін Варшаўскага дагавора. Цвяроза ацэньваючы пагрозу ўзнікнення новай сусветнай вайны, Савецкая дзяржава разам з іншымі сацыялістычнымі краінамі вядзе актыўную, мэтанакіраваную барацьбу за скарачэнне гонкі ўзбраенняў.

У сучасных умовах, калі ідзе барацьба за мір, за ўсеагульнае раззбраенне, роля вучоных-фізікаў асабліва вялікая. Вылучаючы кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР вучонага-фізіка Леаніда Іванавіча Кісялеўскага, мы яшчэ раз на справе пераканаўча выказваем нашу гарачую падтрымку міралюбівага знешнепалітычнага курса Камуністычнай партыі, імкненне ўмацоўваць эканамічную і абаронную магутнасць нашай краіны, наша адзінства.

Сход аднагалосна пастанавіў вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР па Алібегаўскай выбарчай акрузе № 26 Леаніда Іванавіча Кісялеўскага.

●●●

На акруговай перадвыбарнай нарадзе прадстаўнікі працоўных калектываў, якія ўваходзяць у Алібегаўскую выбарчую акругу, падтрымалі вылучэнне кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР рэктара Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна Леаніда Іванавіча Кісялеўскага.

З. АЛЯШКЕВІЧ,
наш кар.

24 ЛЮТАГА 1985 г.
Насустрач выбарам у Саветы

Названы кандыдатамі ў дэпутаты

ПЕРАДВЫБАРНЫ сход выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта аднагалосна вылучыў **Міхаіла Іванавіча ДЗЯМЧУКА,** сакратара парткома універсітэта, доктара фізіка-матэматычных навук і **Аляксандра Міхайлавіча ДЗЕМЯШКЕВІЧА,** студэнта 2-га курса юрыдычнага факультэта кандыдатамі ў дэпутаты ў гарадскі Савет народных дэпутатаў г. Мінска, а таксама **Уладзіміра Трыфанавіча ШАЛАТОНІНА,** старшыню прафкома універсітэта, кандыдата біялагічных навук, дацэнта, **Алу Станіславаўну КАСПЯРОВІЧ,** дацэнта кафедры цеплафізікі і **Інэсу Вячаславаўну КРАЎЧАНКА,** студэнтку 2-га курса механіка-матэматычнага факультэта кандыдатамі ў дэпутаты ў Маскоўскі раённы Савет народных дэпутатаў г. Мінска.

РАЎНЕННЕ НА ПРАВАФЛАНГОВЫХ!

ЯНЦЭВІЧ ВЕРАНІКА, студэнтка IV курса геаграфічнага факультэта, ленінская стыпендыятка.

Не першы год Вераніка атрымоўвае імянную стыпендыю. Есць у дзяўчыны ўстойлівае патрабаванне да сябе — да кожнага вывучаемага прадмета ставіцца як да асноўнага.

Фота А. ВАЛОШЫНА.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

НА НОВЫЯ РУБЯЖЫ

Важнейшай падзеяй у жыцці Белдзяржуніверсітэта з'явілася абмеркаванне яго дзейнасці на бюро ЦК Кампартыі Беларусі. Было разгледжана пытанне «Аб рабоце рэктарата і парткома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна па павышэнню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў у святле рашэнняў чэрвеньскага (1983 г.) Пленума ЦК КПСС».

У прынятай пастанове дакладна вызначаны вялікія і адказныя задачы, якія стаяць перад калектывам універсітэта. Глыбока абмеркаваць гэту пастанову і пакласці яе ў аснову бягучай і перспектыўнай дзейнасці — важнейшая задача ўсяго калектыву. Выкананне пастановы бюро ЦК КПБ дазволіць зрабіць новы вялікі крок у паляпшэнні ўсёй дзейнасці калектыву універсітэта, у павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў.

З ЯРОД ВАЖНЕЙШЫХ пытанняў вызначана задача павышэння эфектыўнасці вучэбнага працэсу. У гэтым напрамку за апошнія гады ва універсітэце праведзена значная работа. Навучанне практычна цалкам пераведзена на новыя тыпавыя вучэбныя планы, якія прадугледжваюць узмацненне навукова-тэарэтычнай і светапоглядной накіраванасці выкладання. У адпаведнасці з запытамі практыкі створаны новыя кафедры, уведзены занава ці істотна перапрацаваны каля 150 спецкурсаў.

Разам з удасканаленнем традыцыйных развіваюцца новыя формы і метады навучання з выкарыстаннем тэхнічных сродкаў і электронна-вылічальнай тэхнікі. На шэрагу факультэтаў выкарыстоўваюцца створаныя ў БДУ аўтаматызаваныя тэлевізійныя навучальныя сістэмы (АТНС) на базе ЭВМ (тры класы на 20 пасадачных месц).

Вядзецца і пэўная вучэбна-метадычная работа, выдаюцца падручнікі і вучэбныя дапаможнікі. Ствараюцца вучэбна-метадычныя комплексы з улікам патрабаванняў кваліфікаваных характарыстык.

Намаганні калектыву па ўдасканаленню вучэбна-выхаваўчага працэсу садзейнічаюць таму, што студэнты БДУ пакідаюць яго сцены ў асноўным падрыхтаванымі да практычнай дзейнасці па абранай спецыяльнасці.

Аднак мы не можам сказаць, што зроблена ў гэтым напрамку выключна ўсё. Сярэдняя паспяховасць студэнтаў за апошнія гады не падымаецца вышэй за 92—93 працэнты на дзённай форме навучання і 80—82 працэнты на вячэрняй і завочнай. А гэта азначае, што сотні студэнтаў (каля 600) пачынаюць кожны новы семестр з запазычанасцямі, што робіць непаспяховасць часта хранічнай. Больш за 300 студэнтаў займаюцца толькі здавальняюча. Мала выдатнікаў — 10,7 працэнта. Усё яшчэ вялікая частка студэнтаў адлічваецца з універсітэта за непаспяховасць. А ўсяго з універсітэта па розных прычынах адлічваецца каля 13 працэнтаў студэнтаў. У сувязі з гэтым мы не выконваем план размеркавання маладых спецыялістаў. Асабліва складаная сітуацыя з захаваннем кантынгента студэнтаў склалася на філалагічным, фізічным факультэтах і факультэце прыкладной матэматыкі.

Мы не дабіліся раўнамернасці паспяховасці па факультэтах і спецыяльнасцях. Нізкую паспяховасць паказвае ў апошні час шэраг факультэтаў. І сярод іх зноў даводзіцца называць фізічны, механіка-матэматычны, філалагічны факультэты, дзе паспяховасць не перавышае 90 працэнтаў.

Усё яшчэ марудна ўкараняюцца актыўныя формы навучання, якія развіваюць пазнавальныя здольнасці, творчае мысленне будучых спецыялістаў. Неабходна палепшыць арганізацыю і правядзенне вытворчай і педагагічнай практык. А ў гэтай справе ў нас яшчэ нямала недахопаў. Не ўсюды распрацаваны скразныя праграмы практык на ўвесь перыяд навучання, слаба распрацоўваюцца метадычныя матэрыялы ў дапамогу студэнтам і кіраўнікам практык.

Патрабуе паляпшэння сістэма арганізацыі экзаменаў, у тым ліку і дзяржаўных. Па-ранейшаму, у парушэнне інструкцыі, студэнты атрымліваюць права на пераздачу экзаменаў у час сесіі, а дазвол на гэтую пераздачу выдаюць не дэканы і іх намеснікі, а супрацоўнікі, якія фактычна не маюць на гэта права.

Сярод першарадных задач, пастаўленых перад універсітэтам, патрэбна выдзеліць удасканаленне прафарыентацыйнай работы, а таксама неабходнасць стварэння сістэмы адбору моладзі для паступлення ў БДУ. У гэтым напрамку ў нас праводзіцца пэўная работа, і ў цэлым мы прымаем добрую моладзь.

Але патрэбна адзначыць наступнае. Калі ўлічваць, што падрыхтоўка спецыялістаў усё больш і больш павінна насіць мэтавы характар, то доля студэнтаў, якія прымаюцца ва універсітэт па накіраваннях, відавочна недастатковая. І тут нам патрэбна шмат папрацаваць. У пастанове бюро ЦК КПБ гаворыцца, што ў 1990 годзе універсітэт павінен давесці мэтавы прыём да 60 працэнтаў. Каб выканаць гэта патрабаванне, нам неабходна істотна палепшыць усю работу па адбору моладзі для паступлення. Патрэбна больш эфектыўна выкарыстоўваць магчымасці падрыхтоўчага аддзялення і падрыхтоўчых курсаў для заахвочвання ў паступленні ва універсітэт моладзі, якая мае працоўны стаж і жыццёвы вопыт.

Такім факультэтам, як фізічны, радыёфізічны, факультэт прыкладной матэматыкі, хімічны і іншым неабходна больш смела ісці на заключэнне прамых дагавораў з прамысловымі прадпрыемствамі па мэтавай падрыхтоўцы спецыялістаў, уносіць гэтыя пытанні ў праграму супрацоўніцтва ў межах ужо існуючых вучэбна-навукова-вытворчых аб'яднанняў. Цесныя кантакты павінны падтрымлівацца і з органамі народнай асветы. Неабходна актывізаваць работу сярод дэмабілізаваных воінаў.

Універсітэт, як ВНУ, якая прымае актыўны ўдзел у падрыхтоўцы педагагічных кадраў для работы ў школе, пачаў перабудову сваёй дзейнасці ў адпаведнасці з патрабаваннямі Закона аб школьнай рэформе.

Аднак мы пакуль яшчэ не вызначылі месца універсітэта ў сістэме іншых ВНУ, якія рыхтуюць педагагічныя кадры, у прыватнасці педінстытутаў. Безумоўна, што вучэбныя праграмы і планы універсітэта не павінны капіраваць планы апошніх.

Пры падрыхтоўцы педагогаў мы павінны цалкам выкарыстоўваць нашы магчымасці ў забеспячэнні глыбокіх фундаментальных ведаў у галіне канкрэтных дысцыплін, якія павінны разумна спалучацца з прывіццём будучым настаўнікам псіхолага-педагагічных ведаў і практыкі. Пакуль такі баланс не ўстаноўлены.

Неабходна развіваць і ўмацоўваць канкрэтныя сувязі са школамі і органамі народнай асветы. Патрэбна заключыць дагаворы аб мэтавым накіраванні абітурыентаў для навучання ва універсітэце па педагагічных спецыяльнасцях, пашыраць пры БДУ сістэму школ юных. Важна таксама павялічыць даследванні ў галіне прафарыентацыі. Асаблівую ўвагу патрэбна звярнуць на работу па заахвочванню ў паступленні на педагагічныя спецыяльнасці мужчын, асабліва тых, якія маюць стаж педагагічнай работы.

ДЗЕЙНАСЦЬ ВНУ у многім вызначаецца ўзроўнем кваліфікацыі яго навукова-педагагічных кадраў. У цэлым можна сказаць, што універсітэт мае неабходныя кадры. Колькасць асноўнага прафесарска-выкладчыцкага саставу на 103 кафедрах універсітэта зараз складае 1333 чалавекі, у тым ліку прафесараў, дактароў навук — 93, дацэнтаў, кандыдатаў навук — 681 чалавек.

Аднак на агульным, здавалася б, добрым фоне нельга не бачыць і сур'ёзныя недахопы. Вось некаторыя факты. Ва універсітэце ёсць яшчэ шмат кафедраў, на якіх няма прафесараў, дактароў навук. Усё гэта яшчэ раз даказвае, што задача падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі — дактароў і кандыдатаў навук — па-ранейшаму застаецца актуальнай і важнай. Да таго ж патрэбна ўлічыць, што універсітэт павінен рыхтаваць дактароў і кандыдатаў навук не толькі для сябе, але таксама і для іншых вучэбных і навуковых устаноў рэспублікі.

На гэту пяцігодку ва універсітэце распрацаваны комплексны план падрыхтоўкі навуковых і навукова-педагагічных кадраў. У адпаведнасці з зацверджаным МінВНУ БССР планам у перыяд з 1981 да 1985 года павінна быць абаронена 35 доктарскіх дысертацый. На сённяшні дзень абаронена 27 дысертацый. У нас назіраецца тэндэнцыя росту колькасці абароненых доктарскіх дысертацый. Так, у 1981 годзе абаронена 4 дысертацыі, у 1982 — 5, у 1983 — 7, у 1984 — 11 дысертацый. Да канца 1985 года плануецца абараніць яшчэ 12 дысертацый. Ёсць падставы думаць, што пяцігадовы план па доктарскіх дысертацыях будзе не толькі выкананы, але і перавыкананы.

Але тут таксама маюцца праблемы. Справа ў тым, што пры падрыхтоўцы пяцігадовага плана кафедры універсітэта ўключылі ў яго абарону доктарскіх дысертацый 108 супрацоўнікамі. З аднаго боку, гэта гаворыць аб тым, што ў нас ёсць нявыкарыстаныя рэзервы для павелічэння колькасці абароненых доктарскіх дысертацый. З другога — напрошваецца вывад аб тым, што на кафедрах не з поўнай адказнасцю падыходзяць да планавання і асабліва выканання плана абароны доктарскіх дысертацый. Не дастаткова эфектыўна выкарыстоўваюцца розныя формы падрыхтоўкі дактароў навук, у тым ліку такая, як перавод на пасаду старшага навуковага супрацоўніка.

Так, на пасаду старшага навуковага супрацоўніка за 22 гады (у перыяд з 1962 да 1984 года) было пераведзена 60 чалавек (у сярэднім каля трох чалавек у год). З іх толькі 23 чалавекі (38,3 працэнта) абаранілі доктарскія дысертацыі.

Больш эфектыўна выкарыстоўваецца такая форма, як творчыя водпускі для напісання дысертацыі. У творчых водпусках у перыяд з 1972 да 1984 года знаходзіліся 35 чалавек. 23 з іх (65,6 працэнта) абаранілі доктарскія дысертацыі, 8 чалавек (22,8 працэнта) не абараніліся, але працягваюць працаваць над дысертацыяй.

План прыёму і выпуску аспірантаў ва універсітэце ў асноўным выконваецца. Аднак эфектыўнасць аспірантуры нізкая. У 1983 годзе са 176 аспірантаў толькі 16 абаранілі і 49 падрыхтавалі да абароны дысертацыйныя работы, што складае 37 працэнтаў.

Неабходна адзначыць, што прыблізна 50 працэнтаў абароненых кандыдацкіх дысертацый ідзе па лініі саіскальніцтва. Карацей, аспірантура губляе сваё значэнне як асноўны шлях падрыхтоўкі кандыдатаў навук. Нам патрэбна больш поўна выкарыстоўваць аспірантуру для мэтавай падрыхтоўкі кандыдатаў навук для іншых ВНУ рэспублікі.

Неабходна ажыццявіць далейшы пераход цэнтра цяжару дысертацыйных распрацовак да патрэб жыцця, карэкціроўку іх з канкрэтнымі заданнямі і комплекснымі праграмамі навукова-тэхнічнага прагрэсу; выяўленне і падтрымку творчых і актыўных маладых выкладчыкаў, якія працуюць па актуальных навуковых напрамках, шляхам стварэння для іх матэрыяльнай базы, пераводу на пасады навуковых супрацоўнікаў і г. д. Неабходна павысіць патрабавальнасць пры атэстацыі супрацоўнікаў, пры іх выбранні і перавыбранні на вакантныя пасады і на новы тэрмін работы, больш поўна выкарыстоўваць механізм сацыялістычнага спаборніцтва для стымулявання росту навукова-педагагічнага ўзроўню выкладчыкаў.

ВАЖНЫМ участкам дзейнасці універсітэта з'яўляецца навукова-даследчая работа. Навуковыя даследванні праводзяцца на ўсіх кафедрах і падраздзяленнях. Гэта два НДІ, ІПК, вылічальны цэнтр, тры праблемныя, восем галіновых і пяць навукова-даследчых лабараторый пры кафедрах. Да навуковых даследванняў у той ці іншай форме прыцягваецца да 70 працэнтаў студэнтаў.

Універсітэт сапраўды выконвае 80 працэнтаў работ, аднесеных да розных праграм. Дадзеныя 80 працэнтаў уключаюць у сябе 365 тэм. А гэта азначае, што большасць тэм самі па сабе не з'яўляюцца значнымі, у іх выкананні занята ўсяго па некалькі чалавек. Гэта тлумачыць і той факт, што ў данай пяцігодцы універсітэт не ўзначаліў выкананне ніводнай праграмы, не толькі саюзнай і рэспубліканскай, але і міжвузаўскай. У той час калі іншыя ВНУ, напрыклад, РТІ, маюць такія праграмы.

У нас няма таксама і сур'ёзных універсітэцкіх праграм, у рамках якіх аб'ядноўваліся б намаганні нашых матэматыкаў, фізікаў, хімікаў, сацыёлагаў, у якіх вырашаліся б важныя для рэспублікі праблемы, напрыклад, у галіне аховы прыроды, меліярацыі, стварэння робататэхнічных сістэм.

Патрабуе істотнага паляпшэння пастаноўка навуковых даследванняў па праблемах вышэйшай школы і выкарыстанню рэзультатаў НДР у вучэбным працэсе.

Ва універсітэце ўжо даўно наспела неабходнасць у арганізацыі пры рэктараце навукова-тэхнічнага савета. У функцыі яго павінна ўваходзіць вызначэнне галоўных, найбольш перспектыўных напрамкаў фундаментальных і прыкладных даследванняў, каардынацыя работ унутры універсітэта і ў сувязі з іншымі ўстановамі і арганізацыямі, вырашэнне пытанняў кадравага і матэрыяльнага забеспячэння.

Патрэбна арганізаваць работу так, каб кожны гаспадарчы дагавор, перш чым ён уключаецца ў план, праходзіў абарону на навукова-тэхнічным савеце, дзе павінна быць ацэнена важнасць працы, мэтазгоднасць яе выканання ў БДУ, умовы матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння, уключаючы размяшчэнне заказаў у СКТБ.

Ужо зараз неабходна прыступіць да распрацоўкі і ўкаранення унутрыуніверсітэцкіх комплексных праграм, якія аб'ядноўваюць намаганні вучоных розных напрамкаў, накіраваных на вырашэнне Харчовай праграмы, праблемы аховы прыроды, стварэнне робататэхнічных сістэм і інш. Для гэтай мэты патрэбна шырэй выкарыстоўваць практыку арганізацыі часовых комплексных творчых груп з удзелам навуковых супрацоўнікаў, аспірантаў і студэнтаў.

ЯК СТАНОЎЧУЮ з'яву можна адзначыць, што ў БДУ назіраецца ўмацаванне сувязі вучэбнага працэсу са студэнцкімі навуковымі даследваннямі. Каля дзвюх тысяч студэнтаў удзельнічалі ў выкананні разам з супрацоўнікамі планавых заданняў, з іх 400 працавалі па гаспадарча-дагаворнай тэматыцы.

Аднак і ў гэтай справе шмат недахопаў. Асноўны з іх — фармальны падыход да арганізацыі працы студэнтаў на некаторых кафедрах. Здараецца, што навукова-метадычная работа па фарміраванню ў студэнтаў творчых навыкаў, праяўленне патрабавальнасці падмяняюцца залішняй апекай, а часам і выкананнем супрацоўнікамі асноўнай часткі даследванняў за студэнтаў.

Неабходна, каб да кіраўніцтва студэнцкімі даследваннямі больш шырока далучаліся нашы вядучыя, творча актыўныя выкладчыкі і навуковыя супрацоўнікі. Гэтай работай павінны займацца і НДІ.

Патрэбна таксама актывізаваць работу савета студэнцкіх навукова-даследчых лабараторый, працягваць іх арганізацыю, вызначыўшы для іх важнейшыя навуковыя напрамкі на XII пяцігодку і аб'ём фінансавання.

БДУ імя У. І. Леніна вядомы сваімі вялікімі дасягненнямі не толькі ў рэспубліцы, але і за яе межамі. У сваёй дзейнасці універсітэт адчувае пастаянную дапамогу і падтрымку з боку ЦК Кампартыі Беларусі, Савета Міністраў БССР, МінВНУ СССР і БССР.

Новым праяўленнем клопату аб універсітэце з'яўляецца абмеркаванне яго дзейнасці на пасяджэнні бюро ЦК Кампартыі Беларусі. У прынятай пастанове калектыў БДУ імя У. І. Леніна нацэльваецца на новыя, больш высокія рубяжы ў сваёй дзейнасці.

Л. КІСЯЛЕЎСКІ,
рэктар БДУ імя У. І. Леніна,
акадэмік АН БССР.

ВУЧОБА — ГАЛОЎНАЯ ПРАЦА СТУДЭНТА

БЫЦЬ, А НЕ ЗДАВАЦЦА

ШЛЯХ да групы ў кожнага з іх быў свой. Хтосьці, вось як Ірына Вернігор, яшчэ з першай сустрэчы вырашыў, што група для яго стане не проста калектывам, дзе пройдзе пяць студэнцкіх гадоў, а нечым больш блізкім і дарагім. А вось для Валерыя Шчапіна, Улана Рамуальда, Генадзя Смяяна гэты шлях аказаўся больш складаным. У групе перавага была на баку дзяўчат, і не толькі ў іх колькасным саставе, але і ў ініцыятыўнасці, дзелавітасці. Хлопцы прывыклі: што праводзіцца ў групе — арганізоўваюць дзяўчаты. Ды яшчэ як арганізоўваюць! Таму заўсёды згаджаліся. І над падрыхтоўкай таго вечара гумару дзяўчатам таксама прыйшлося шмат папрацаваць. А тут хлопцы сюрпрыз падрыхтавалі: паставілі сцэны са студэнцкага жыцця. Усе былі прыемна здзіўлены.

На грамадска-палітычнай атэстацыі Святлана Шарстабітава атрымала нездавальняючую адзнаку. Атрымалася так, што сур'ёзных даручэнняў на працягу года ёй не давалі, выконвала часовыя, ды і не заўсёды добра. Адчувалася яе адараванасць ад групы. Камсорг Ірына Вернігор прапанавала: а што калі мы даручым Святлане кіраваць сектарам інтэрнацыянальнага выхавання. Ірыну падтрымалі. А для Святланы гэта даручэнне стала аб'ектам прыкладання ўсіх сіл. Яна ўжо правяла дзве сустрэчы з замежнымі студэнтамі. Тое давер'е, якое аказала група, пераканала дзяўчыну ў тым, што яна ў калектыве зусім не выпадковы чалавек.

А яшчэ кожны з іх добра памятае той дыспут «Калі я сам дзеля сябе, дык навошта быць мне?» Сабраліся ў пакоі, селі ў круг. Спярша кожны ўставаў і расказваў пра сябе, пра свае адносіны да групы. Помніцца, як падняўся Саша Карпаў і папрасіў «Скажыце адкрыта пра мяне. Усё што думаеце». Гаварылі, гаварылі шчыра: і пра добрыя якасці, і зусім не баяліся крытыкаваць.

Вось так, крок за крокам, ішоў кожны з іх да сваёй групы. Ішоў не толькі таму, каб зараз яго групу называлі першай на патоку, пераможцай на факультэце, выдзялялі ва універсітэце, ішоў «каб быць, каб быць сапраўдным, а не проста здавацца ім». Гэтую ісціну ўжо даўно кожны вызначыў для сябе. Дыспут пад такой назвай «Быць, а не здавацца» толькі падвёў іх да агульнага меркавання: «Жыццё — складаная рэч. І ты можаш недзе памыліцца, нешта зрабіць не так, але прынцыпы твае павінны заставацца нязменнымі». Нязменна і тое сяброўства, якое аб'ядноўвае групу.

Валерый Шчапін, Генадзь Смяян, Павел Карпаў, Улан Рамуальд — гэтых прозвішчаў у спісе групы сёння няма. Хлопцы служаць у радах Савецкай Арміі. Але па-ранейшаму яны тут. «Сумуем,— гавораць дзяўчаты.— Часта ўспамінаем. Вельмі цяжка без Паўла Карпава. Ён адзіны, хто іграў у нас на гітары». І як яны радуюцца, калі атрымліваюць паштоўку з салдацкім прывітаннем. «Часта ўспамінаю нашу першую «бульбу», дыспуты, вечары. Улан Рамуальд». «Мы хочам, каб вы заўсёды памяталі нас, тых, хто абараняе мірны пакой. Павел Карпаў». І ляцяць у розныя куткі краіны паштоўкі з адваротным адрасам «мехмат, 3 курс, II група...»

Яшчэ абавязкова трэба сказаць пра Марыну Макарэвіч. Прынцыповая, адказная, патрабавальная. Відаць, толькі такім і павінен быць старшыня «Камсамольскага пражэктара». Дарэчы, Марына ўзначальвае «Камсамольскі пражэктар» факультэта. Яна заўсёды змагаецца з недахопамі. Той, хто бачыў выпускі «Камсамольскага пражэктара» пад кіраўніцтвам Марыны, гэта зразумее.

Калі Ірыну Кулік выбралі адказнай за культурна-масавы сектар у групе, Улан Рамуальд сказаў: «У выбары мы не памыліліся. Ужо на «бульбе», акрамя абавязковага канцэрта для мясцовых жыхароў, арганізавала КВЗ — паміж хлопцамі і дзяўчатамі. Даведаліся, што ёсць у групе і добрыя мастакі, і спевакі, і паэты».

Зараз усе справы групы вызначае сесія. Як-ніяк, а вучоба — справа галоўнейшая. Шмат клопатаў у Галіны Шкар. Яна выдатніца. Першым сваім абавязкам лічыць дапамагчы таварышам у вучобе. Калі ў Барыса Савіцкага склалася цяжкае становішча з вучобай, яна і кансультавала яго перад экзаменам, і хварэла за яго кожную адзнаку ў залікоўцы. Ей не ўсё роўна, якія адзнакі атрымаюць Ірына Тарасевіч, Вольга Кобец, Вольга Любецкая...

Група рыхтуецца да экзаменаў. Галоўная мэта — здаць іх як мага лепш. І зараз яны яшчэ больш разумеюць, наколькі патрэбны адзін аднаму. У кароткія хвіліны перапынкаў вырашаюць, як лепш правесці медыум, як арганізаваць дыспут, мараць пра будатрад «Стэлуцу»...

А. МАТУСЕВІЧ.

Наш фотакарэспандэнт А. ВАЛОШЫН сустрэўся з групай у адзін з самых адказных для яе момантаў — ішоў экзамен «Функцыянальны аналіз».

НА ЗДЫМКАХ: да экзамена рыхтуецца Марына Макарэвіч;

яшчэ адна пяцёрка ў залікоўцы;

апошнія хвіліны перад экзаменам;

ВЯРТАЮЧЫСЯ ДА НАДРУКАВАНАГА

«Патрабуецца... ад выкладчыка»

У АДНЫМ З чэрвеньскіх нумароў газеты «Беларускі універсітэт» мяне зацікавіў артыкул В. Чарняўскага «Сесія... з варыянтамі». У ім пастаўлена вельмі надзённае пытанне: ці адпавядае сістэма здачы экзаменаў у нашых вышэйшых навучальных установах сучасным патрабаванням падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў? Я — студэнт 4-га курса. На сённяшні дзень здаў ужо 27 экзаменаў і безліч залікаў. І я таксама, як і аўтар, лічу: патрэбна мяняць сістэму здачы экзаменаў.

Тыя веды і інфармацыя, якія нам даюць на лекцыях, ненадоўга застаюцца ў галаве. Напэўна, гэта вынік таго, што абсалютная большасць студэнтаў вывучае матэрыял толькі ў час сесіі. На занятках выкладчыкі імкнуцца паведаміць як мага болей, выходзячы з таго, што хоць нешта ды застанецца. Але якая доля таго, што застаецца? Аўтар артыкула сцвярджае — 0,1 працэнта ўсяго матэрыялу. Пагадзіцеся, гэта не многа. Можа неабходна менш загружаць студэнта ў вучэбны час? Пацікаўцеся, колькі лабараторных, практыкумаў у студэнта-радыёфізіка. Агульнавядома: больш, чым у студэнтаў іншых факультэтаў. Да чаго ж прыводзіць такая загружанасць? Да таго, што большасць студэнтаў усе свае веды накіроўваюць на тое, як з меншымі затратамі ўсё гэта зрабіць.

Маю і такія меркаванні. З аднаго боку, у студэнта мала часу на самастойную работу. Да таго ж, ніхто не вучыць, як найбольш правільна яе арганізоўваць. З другога боку, асноўнае патрабаванне выкладчыкаў: вы павінны працаваць самастойна. Мы даём вам асновы, а вы павінны разбірацца ў дробязях самі.

А чаму б не паглыбляць свае веды не толькі дома, а і на занятках. Напрыклад, лектары замест чытання лекцый раздаюць студэнтам перадрукоўкі сваіх лекцый. Мы знаёмімся з матэрыялам загадзя, а на лекцыях абмяркоўваем яго з выкладчыкамі. Такое засваенне матэрыялу не толькі больш эфектыўнае, але і больш цікавае. Разам з гэтым у выкладчыка адпадае неабходнасць «знаёміцца» са студэнтам. Ён ужо будзе ведаць апошняга не толькі па практычных, але і па лекцыях.

Тут асноўная цяжкасць у тым, каб пастаянна аднаўляць свае лекцыі, будаваць іх на сучасных даных навукі і тэхнікі. Вядома, гэта патрабуе ад выкладчыкаў пастаяннай работы над сабой.

А. ЦЯЛЕГІН.
студэнт факультэта радыёфізікі і электронікі.

«Я — СУПРАЦЬ «ЛАГІЧНЫХ БЛОКАЎ»

ПРАБЛЕМА экзаменаў нікога не пакідае абыякавым. Таму я хачу падтрымаць размову, пачатую на старонках газеты «Беларускі універсітэт» у артыкуле «Сесія... з варыянтамі».

Лічу (і гэта, напэўна, не толькі мая думка), што цяперашняя форма правядзення экзаменаў жадае быць лепшай. Сярод студэнтаў распаўсюджана спісванне, часам бяздумнае, а калі не спісванне, то зубрэнне канспекта. Ды і сам студэнцкі афарызм «Экзамен — гэта латарэя» шмат аб чым гаворыць. Выкладчыку цяжка аб'ектыўна ацаніць веды студэнтаў, асабліва калі ён не вёў у іх практычныя ці лабараторныя заняткі, цяжка таксама скласці раўназначыя білеты. Таму на ацэнку студэнта ўплывае і ўменне падаць матэрыял, і настрой выкладчыка, і яго адносіны да экзаменуемага.

Некаторыя нашы выкладчыкі спрабуюць унесці змены ў форму правядзення экзаменаў. Напрыклад, дазваляюць карыстацца канспектамі, даюць магчымасць здаваць матэрыял часткамі. Але мне здаецца, што не ўсе гэтыя новаўвядзенні апраўдваюць сябе. Так, напрыклад, адзін выкладчык праводзіць экзамен у выглядзе пісьмовай работы, прычым выцягваецца адзін білет, а яго пытанні з'яўляюцца агульнымі для ўсіх.

Пасля заканчэння работы студэнты пачынаюць абменьвацца імі і ацэньваць веды суседа. Праверка заключаецца ў знаходжанні так называемых «лагічных блокаў», за кожны з якіх ставіцца пэўная колькасць ачкоў. Прычым (і гэта самае галоўнае) складваюцца агрэсіўныя адносіны адзін да аднаго: чым горш напіша таварыш, тым выйгрышней будзе тваё становішча. Улік гэтых «блокаў» вядзецца па канспекту выкладчыка, адкуль ён іх і зачытвае.

Затым складаецца крывая, графік залежнасці колькасці студэнтаў ад агульнага бала. Студэнты, атрымаўшыя колькасць балаў-аргументаў левай часткі крывой, атрымліваюць «добра», астатнія — «выдатна». Здаецца, усё добра. Але я не магу назваць ніводнага студэнта, які б быў задаволены гэтым экзаменам.

Мяне гэта вельмі хвалюе, таму што я лічу: са студэнта павінен атрымацца добры спецыяліст, а не нейкі зубрылка «лагічных блокаў». Я падымаю абедзве рукі за метад выкладчыка Г. Грамыкі з Обнінска, які вучыць студэнтаў «з канца». Нагадаю: прапаноўваецца спіс пытанняў і літаратура. Праз два тыдні патрэбна здаць залік, які праводзіцца ў выглядзе вусных адказаў каля дошкі (прычым без падрыхтоўкі). Да заліку праводзяцца кансультацыі. Мне здаецца, што іменна такая форма, калі пасля «уступнага» заліку студэнт і выкладчык маюць магчымасць свабодна пагутарыць, абмеркаваць праблемы, стварае творчую атмасферу на экзамене і ператвараецца ў адзін з самых эфектыўных відаў вучэбнай дзейнасці.

М. РАТНІКАВА,
студэнтка механіка-матэматычнага факультэта.

ФІЗКУЛЬТУРА СПОРТ ФІЗКУЛЬТУРА

ВІНШУЕМ!

ЛАЎРЭАТЫ ГОДА

ПА ІНІЦЫЯТЫВЕ газеты «Беларусі універсітэт» спартыўны клуб і кафедра фізвыхавання і спорту вызначылі пяць лепшых спартсменаў па выніках 1984 года. Лаўрэатамі сталі:

КАМАНДАР МАДЖЫДАЎ (юрфак, 2-гі курс) — заслужаны майстар спорту СССР, класічная барацьба, які ў мінулым годзе перамог на чэмпіянаце Еўропы, міжнародных спаборніцтвах «Дружба-84», стаў прызёрам чэмпіяната СССР.

ГАЛІНА САВІЦКАЯ (журфак, 3-ці курс) — заслужаны майстар спорту СССР, баскетбол, чемпіёнка свету, Еўропы, міжнародных спаборніцтваў «Дружба-84».

АЛЕГ НАДЗІН (фізфак, 3-ці курс) — майстар спорту СССР міжнароднага класа, водналыжны спорт, прызёр чэмпіяната СССР.

ЭЛЬМІРА ХАРАВЕЦ (журфак, 5-ы курс) — майстар спорту СССР, шахматы, чэмпіёнка БССР.

ВАДЗІМ КАРЖЭЛЬ (геафак, 4-ы курс) — майстар спорту СССР, класічная барацьба, чэмпіён БССР сярод моладзі, прызёр чэмпіяната БССР сярод дарослых і СССР сярод моладзі.

Віншуем лаўрэатаў і жадаем у новым годзе далейшых спартыўных поспехаў!

НАШ КОНКУРС

РЭДАКЦЫЯ газеты «Беларускі універсітэт» і спартыўны клуб універсітэта аб'яўляюць новы конкурс спартыўных насценных газет факультэтаў з мэтай паляпшэння прапаганды спорту ва універсітэце.

Спортбюро факультэтаў павінны падаць у спортклуб усе насценгазеты, выпушчаныя ў гэтым навучальным годзе. Апошні тэрмін падачы — 20 сакавіка.

Утворана журы конкурсу. Пры падвядзенні вынікаў журы будзе ўлічваць якасць і змест матэрыялаў, ілюстрацый, разнастайнасць тэматыкі і жанраў, аператыўнасць, дзейснасць выступленняў.

Пераможцаў чакаюць прызы. Жадаем поспехаў!

ШАХМАТЫ

СПОРТ, НАВУКА, МАСТАЦТВА...

ІМЕННА ТАК людзі здаўна характарызавалі старажытную шахматную гульню. Ну а тое, што шахматы — гэта перш за ўсё спорт, пераканаўча даказала нядаўняе першынство універсітэта, у якім прынялі ўдзел усе факультэты. Па выніках спаборніцтва ў падгрупах былі названы чатыры мацнейшыя каманды — зборныя фізфака, факультэта радыёфізікі і электронікі, ФПМ і мехмата, якія працягвалі гульню ў фінальнай групе. Спачатку здавалася, што зборная фізфака, якую ўзначальвалі кандыдаты ў майстры спорту Г. Крылоў і Л. Смелы, мае шансы паўтарыць свой мінулагодні поспех і зноў заваяваць першае месца. Аднак у апошнім туры адстаючая на два ачкі каманда факультэта радыёфізікі і электронікі здолела наладзіць гульню і выйграла з «сухім» лікам — 7 : 0 — у зборнай ФПМ. У выніку зборныя факультэта радыёфізікі і электронікі і фізфака набралі аднолькавую колькасць ачкоў, але па выніках выйгранага матча ў паўфінале дружная каманда радыёфізікаў заняла першае месца. На другім месцы — зборная фізікаў, на трэцім — каманда механіка-матэматычнага факультэта, на чацвёртым — ФПМ. Вось імёны пераможцаў першынства: В. Данкоў, Д. Крыцкі, І. Віннічак, Г. Прыбыток, С. Піскун, Л. Стральцова, В. Зянькевіч.

На чэмпіянаце было сыграна нямала прыгожых, захапляючых матчаў, якія прынеслі задавальненне як самім удзельнікам, так і балельшчыкам.

Спаборніцкая дзейнасць шахматыстаў прыцягвае ў апошні час усё большую ўвагу з боку вучоных-псіхолагаў. Тут адкрываюцца шматлікія магчымасці для вывучэння асноўных механізмаў і этапаў творчага мыслення чалавека — адной з актуальных праблем сучаснай агульнай псіхалогіі.

Як паказалі нашы даследаванні па вывучэнню рэгулюючай функцыі самаацэнкі шахматыста, гэта псіхалагічнае ўтварэнне істотным чынам уздзейнічае як на асаблівасці разумовай дзейнасці спартсмена, так і на эмацыянальную ўстойлівасць. Адэкватная самаацэнка шахматыста з'яўляецца залогам эфектыўнасці яго спаборніцкай дзейнасці. Вынікі чэмпіяната даюць багаты матэрыял для роздуму і будуць улічаны пры фарміраванні зборнай БДУ для ўдзелу ў гарадскіх і рэспубліканскіх спаборніцтвах.

Л. ЛЕВІТ,
трэнер зборнай універсітэта па шахматах.

НА ЗДЫМКАХ: шахматны паядынак каманд фізфака і філфака; за каманду журфака на першай дошцы выступала майстар спорту Э. Харавец.

Фота А. ВАЛОШЫНА.

АЭРОБІКА

У ВІХУРЫ РЫТМАЎ

АЭРОБІКА... Гэтае слова зараз можна пачуць даволі часта. Ёсць у яго і сінонімы: спартыўная дыскатэка, гімнастычныя танцы і нават «поп-мабільнасць».

Асабліва папулярны гэты від спорту сярод моладзі, хаця ўзнік ён зусім нядаўна. Афіцыйна нараджэнне аэробікі ў нашым універсітэце было адзначана ў кастрычніку мінулага года. Студэнты і супрацоўнікі наведваюць заняткі па рытмічнай гімнастыцы 3 разы ў тыдзень. Створана 8 груп, але і яны не могуць прыняць усіх жадаючых.

Нельга не згадзіцца, што адным з самых цудоўных адчуванняў з'яўляецца пачуццё ўлады над сваім целам, якое насуперак законам фізікі, здаецца, пераадольвае зямное прыцягненне. Гармонія і пластычнасць, прыгажосць і дакладнасць рухаў — вось састаўныя часткі рытмічнай гімнастыкі.

Але давайце падумаем, ці толькі прыгажосць вабіць аматараў спорту? Як гаварылі старажытныя: харство і здароўе неразрыўна звязаны. Возьмем на сябе смеласць і скажам так: «Хочаш быць здаровым — займайся аэробікай, хочаш быць разумным — займайся рытмічнай гімнастыкай, хочаш быць прыгожым — хадзі на спартыўныя дыскатэкі».

А вось якія меркаванні наконт гэтага выказала старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту В. В. Сеўба:

— Галоўнай мэтай нашых заняткаў з'яўляецца ўсебаковае аздараўленне арганізма. Аэробіка адрозніваецца ад астатніх відаў спорту тым, што нагрузка раўнамерна размяркоўваецца на ўсе мышцы. Есць і паўзы, якія таксама запаўняюцца неабходнымі практыкаваннямі. Наогул, нагрузкі яшчэ невялікія: усяго 45 мінут заняткаў. Пасля гімнастыкі ўсе выглядаюць стомленымі, але, як яны самі гавораць, настрой у іх значна паляпшаецца.

Есць групы толькі студэнцкія, а ёсць змешаныя, дзе займаюцца і студэнты, і выкладчыкі, ёсць таксама і асобна выкладчыцкія.

— Прыходзьце да нас на заняткі ў змешаную групу, і я ўпэўнена, вы не адрозніце студэнтаў ад выкладчыкаў,— пажартавала Валянціна Васільеўна.

Нашай размове перашкаджаў шум у зале. Акрамя групы рытмічнай гімнастыкі тут займалася яшчэ некалькі спартыўных секцый.

— Нічога не зробіш, не хапае месца,— разважае В. В. Сеўба. — Калі б дазвалялі ўмовы, можна было б стварыць дадатковыя групы. Трэнеры І. Сякрэт, майстар спорту па мастацкай гімнастыцы і І. Глушак, кандыдат у майстры па гэтаму ж відў — працуюць з поўнай нагрузкай. Заняткі мы праводзім па праграме, створанай Дзяржаўным камітэтам па фізічнай культуры і спорту пры Савеце Міністраў СССР. З ёй я пазнаёмілася на дзесяцідзённым семінары, які праходзіў у Маскве. Навучылася многаму. Спадзяюся, што змагу выкарыстаць гэтыя веды з карысцю для навучэнцаў. Аб спартсменках гаварыць яшчэ рана. У іх ёсць галоўнае — жаданне працаваць, а рэзультат прыйдзе з часам.

...Мы пакідалі залу з пачуццём захаплення ўбачаным. І ў нас таксама палепшыўся настрой.

І. РУСЕЦКАЯ,
студэнтка факультэта журналістыкі.

АД ЗНАЧКА ГПА — ДА ЗВАННЯ ЧЭМПІЁНА!

«СТВАРАЮ СВОЙ ВОБРАЗ...»

СВЕТЛАВАЛОСАЯ, невысокая дзяўчына — такой мы ўбачылі Таццяну Шыпіцу, нашу аднакурсніцу, восенню 1983 года. Цяжка сказаць, шчырая ўсмешка ці ветлівы позірк блакітных вачэй выдзелілі яе сярод шумнай чаргі першакурснікаў.

А мы захапіліся Таццянай, калі на спартыўным вечары факультэта вядучы аб'явіў чарговы нумар і на пляцоўку выйшла наша Таня, майстар спорту па мастацкай гімнастыцы. І гэта была не проста наша аднакурсніца, студэнтка факультэта журналістыкі. Новы цудоўны вобраз ствараўся перад вачыма гледачоў. Колькі грацыі, колькі прыгажосці было ў яе рухах! Перад намі было ўвасабленне вечнай мары чалавека аб дасканалай гармоніі, аб прыгажосці...

Лёгкасць і прыгажосць, якія характарызуюць спартсменку, дасягаюцца нястомнай працай над сабой на працягу многіх год. Трэніроўкі, трэніроўкі, трэніроўкі... Шэсць раз у тыдзень, ніводнай свабоднай хвіліны. Кожная гадзіна падпарадкавана раскладу. Не, гэта не спартанскія адносіны да сябе, а ўменне размяркоўваць свой час, так, каб яго хапіла і на вучобу, і на заняткі спортам.

У сем год Таня ўпершыню зрабіла нясмелыя крокі па гімнастычнаму падмостку.

1980 год — своеасаблівы ў яе спартыўнай біяграфіі. Майстар спорту! Доўгачаканы вынік шматгадовай напружанай працы. Не заганарылася, а галоўнае — не спынілася ў творчым росце.

1983 год. Таццяна Шыпіца паступае на факультэт журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна, пераходзіць у ДСТ «Буравеснік».

1984 год. Усесаюзныя спаборніцтвы ў Маскве, у якіх удзельнічаюць мацнейшыя гімнасткі краіны. Тані ўручаюць спецыяльны «Прыз сімпатый». Так, абаяльнасці ў яе шмат, і не толькі ў спартыўных выступленнях, але і чыста чалавечай.

Сумяшчаць трэніроўкі і вучобу, як прызнаецца Таня, цяжка. Але ў залікоўцы студэнткі стаяць толькі добрыя і выдатныя адзнакі.

У час сесіі ў пакоі Тані доўга не гасне святло. Экзамены. Трэба добра падрыхтавацца і здаць, як належыць майстру.

К. ЧАПЛЯ,
студэнтка факультэта журналістыкі.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа.

Зак. 2209. АТ 13030.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ